ПАСТАНОВА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

29 лістапада 2000 г. № 1818

Аб мінімальных стаўках аўтарскага ўзнагароджання за выкананне заказаў на стварэнне твораў літаратуры і мастацтва для публічнага выканання або за права першага публічнага выканання неабнародаваных твораў

Изменения и дополнения:

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 15 июля 2002 г. № 949 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2002 г., № 82, 5/10802) <C20200949>

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 16 мая 1996 года «Аб аўтарскім праве і сумежных правах» Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Устанавіць мінімальныя стаўкі аўтарскага ўзнагароджання за выкананне заказаў на стварэнне твораў літаратуры і мастацтва для публічнага выканання або за права першага публічнага выканання неабнародаваных твораў згодна з дадаткам. Указаныя выплаты аўтарскага ўзнагароджання праводзяцца ў межах гадавых бюджэтных фінансавых асігнаванняў, прадугледжаных на гэтыя мэты.

2. Прызнаць страціўшай сілу пастанову Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 мая 1996 г. № 342 «Аб стаўках аўтарскага ўзнагароджання за выкананне заказаў на стварэнне твораў літаратуры і мастацтва для публічнага выканання або за права першага публічнага выканання неапублікаваных твораў» (Збор указаў Прэзідэнта і пастаноў Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь, 1996 г., № 15, арт. 380).

Прэм’ер-міністр Рэспублікі Беларусь — У.Ярмошын

Дадатак

да пастановы
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь

29.11.2000 № 1818

Мінімальныя стаўкі аўтарскага ўзнагароджання за выкананне заказаў на стварэнне твораў літаратуры і мастацтва для публічнага выканання або за права першага публічнага выканання неабнародаваных твораў

| № п/п | Віды твораў | Мінімальныя стаўкі аўтарскага ўзнагароджання (базавых велічын) |
|---|---|---|

| | | |
|---|---|---|
| | **Драматычныя творы** | |
| 1. | П’еса шматактовая: | |
| | у прозе | 28 |
| | у вершах | 58 |
| 2. | П’еса аднаактовая: | |
| | у прозе | 12 |
| | у вершах | 18 |
| 3. | П’еса шматактовая для тэатраў юнага гледача: | |
| | у прозе | 43 |
| | у вершах | 72 |
| 4. | П’еса шматактовая для лялечных тэатраў: | |
| | у прозе | 28 |
| | у вершах | 43 |
| 5. | Інсцэніроўка шматактовая | 11 |
| 6. | Інсцэніроўка аднаактовая | 5 |
| 7. | Пераклад шматактовай п’есы: | |
| | у прозе | 8 |
| | у вершах | 9 |
| 8. | Пераклад аднаактовай п’есы: | |
| | у прозе | 3 |
| | у вершах | 4 |
| | **Музычныя творы** | |
| 9. | Опера шматактовая | 170 |
| 10. | Балет шматактовы | 142 |
| 11. | Аперэта, музычная камедыя, мюзікл шматактовыя | 84 |
| 12. | Араторыя (для хору з сімфанічным аркестрам, аркестрам народных інструментаў, духавым і камерным аркестрамі) | 40 |
| 13. | Кантата (для хору a capella, для хору з сімфанічным аркестрам, аркестрам народных інструментаў, камерным аркестрам) | 30 |
| 14. | Сімфонія (для сімфанічнага аркестра, аркестра народных інструментаў, духавога і камернага аркестраў) | 50 |
| 15. | Канцэрт (для сімфанічнага аркестра, аркестра народных інструментаў, духавога і камернага аркестраў, хору a capella, саліруючых інструментаў і голасу з аркестрам) | 45 |
| 16. | Буйны праграмны сімфанічны твор, сімфаньета | 35 |

| | |
|---|---|
| 17. Варыяцыі, сюіты, канцэрціна і іншыя буйныя творы (для сімфанічнага аркестра, аркестра народных інструментаў, духавога, камернага і эстраднага аркестраў) | 15 |
| 18. Фантазія, рапсодыя, уверцюра, парафраз (для сімфанічнага аркестра, аркестра народных інструментаў, духавога, камернага і эстраднага аркестраў) | 10 |
| 19. Невялікі адначасткавы твор для аркестра, для саліруючых інструментаў і для голасу ў суправаджэнні аркестраў розных саставаў | 3 |
| 20. Камерны ансамбль буйной формы (трыо, квартэт, квінтэт, секстэт і іншыя, уключаючы ансамблевую санату) | 15 |
| 21. Сюіта для камернага ансамбля, саліруючых інструментаў | 7 |
| 22. Саната для саліруючых інструментаў | 15 |
| 23. Буйны адначасткавы інструментальны твор (паэма, рапсодыя, балада, прэлюдыя і фуга, пасакалія, канцэртная п’еса і інш.) | 7 |
| 24. Парафраз, транскрыпцыя для камерных ансамбляў і саліруючых інструментаў | 7 |
| 25. Дробны інструментальны камерны твор | 3 |
| 26. Буйны твор для хору a capella і з інструментальным суправаджэннем | 4 |
| 27. Твор малой формы для хору a capella і з інструментальным суправаджэннем | 3 |
| 28. Вакальны камерны ансамбль з суправаджэннем і без суправаджэння, цыклічныя вакальныя творы для голасу з інструментальным суправаджэннем | 5 |
| 29. Раманс, балада, вакаліз, канцэртная арыя і іншыя камерныя творы для голасу з суправаджэннем | 2 |
| 30. Музыка да песні | 2 |
| 31. Опера для выканання дзіцячымі мастацкімі калектывамі | 28 |
| 32. Музыка да тэатральна-драматычнай пастаноўкі | 16 |
| 33. Электронная музыка | 5 |

Заўвагі: 1. Аплата музыкі аднаактовых оперы, балета, аперэты, музычнай камедыі,

мюзікла праводзіцца ў памеры ад 50 працэнтаў стаўкі за шматактовы твор.

2. Аплата рэдакцый музычных твораў праводзіцца ў памеры ад 30 працэнтаў ад арыгінала.

3. Апрацоўка народных песень аплачваецца ў памеры ад 50 працэнтаў стаўкі за арыгінальны твор.

4. Інструментальныя пералажэнні (свабодныя) аплачваюцца ў памеры ад 50 працэнтаў стаўкі за арыгінальны твор.

5. Інструментальныя пералажэнні (простыя) аплачваюцца ў памеры ад 25 працэнтаў стаўкі за арыгінальны твор.

6. Аплата музычных твораў для дзяцей і юнацтва, музычна-педагагічных твораў для дзіцячых музычных школ праводзіцца па стаўках аўтарскага ўзнагароджання, устаноўленых за адпаведны жанр сачынення.

## Літаратурныя творы, звязаныя з музыкай

| | | |
|---|---|---|
| 34. | Лібрэта шматактовай оперы | 48 |
| 35. | Лібрэта шматактовых аперэты, музычнай камедыі, мюзікла | 34 |
| 36. | Лібрэта шматактовага балета | 17 |
| 37. | Лібрэта араторыі, кантаты | 7 |
| 38. | Пераклад лібрэта шматактовых оперы, аперэты, музычнай камедыі, мюзікла | 14 |
| 39. | Пераклад лібрэта аднаактовых оперы, аперэты, музычнай камедыі, мюзікла | 8 |
| 40. | Харэаграфія шматактовага балета | 72 |
| 41. | Харэаграфія аднаго балетнага нумара | 2,8 |

Заўвага. Аплата лібрэта аднаактовых оперы, аперэты, музычнай камедыі, мюзікла, балета і харэаграфіі аднаактовага балета праводзіцца ў памеры ад 50 працэнтаў стаўкі за адпаведны шматактовы твор.

## Творы для эстрады і цырка

| | | |
|---|---|---|
| 42. | Скетч, драматычны эцюд | 2 |
| 43. | Фельетон, мініяцюра, інтэрмедыя, канферанс (скразны), апавяданне, навела, маналог | 1,6 |

| | |
|---|---|
| 44. Тэкст для песні | 1 |
| 45. Куплеты і прыпеўкі (за чатырохрадкоўе) | 0,1 |
| 46. Музыка для куплетаў і прыпевак | 0,6 |
| 47. Мантаж, кампазіцыя, літаратурнае афармленне эстрадных нумароў і нумароў арыгінальнага жанру | 1,2 |
| 48. Уступны маналог для вядучага | 1 |
| 49. Пралог і фінал (для выканання калектывам) | 2,6 |
| 50. Кароткі дыялог (інтэрмедыя) | 0,3 |
| 51. Кароткі вершаваны тэкст | 0,3 |
| 52. Раёк | 1,4 |
| 53. Літаратурная перапрацоўка антрэ | 1,2 |
| 54. Клоунскае антрэ, антрэ для музычных эксцэнтрыкаў | 2,4 |
| 55. Асобны рэпрыз | 1 |
| 56. Пантаміма, сюжэтнае цыркавое прадстаўленне (лібрэта, тэкст) | 13 |
| 57. Сцэнарый цыркавога нумара (сюжэтная, трукавая і тэхнічная распрацоўка новага арыгінальнага нумара) | 3 |
| 58. Сцэнарый цыркавога атракцыёна (сюжэтная, трукавая і тэхнічная распрацоўка новага арыгінальнага атракцыёна) | 6 |
| 59. Музычны ўступ, антракт да цыркавога або эстраднага прадстаўлення | 1 |
| 60. Музыка для цыркавога нумара (цыклічны твор) | 8,6 |
| 61. Музыка да цыркавога атракцыёна, пантамімы, сюжэтнага цыркавога спектакля ў адным аддзяленні, балет на лёдзе | 23 |
| 62. Марш, галоп, вальс, полька, інтэрмецца, раманс і іншыя дробныя п’есы | 1,6 |
| 63. Дробныя музычныя творы, прызначаныя для суправаджэння цыркавога або эстраднага нумара | 0,3 |
| 64. Музычнае кампілятыўнае афармленне цыркавога або эстраднага нумара | 0,3 |
| 65. Сцэнарый і тэкст сюжэтнага эстраднага прадстаўлення | 14,2 |

| | |
|---|---|
| 66. Літаратурны сцэнарый масавага свята, сцэнарый прадстаўлення | 3 |

Заўвагі: 1. Двухчасткавая музыка да куплетаў аплачваецца ў адпаведнасці з пунктам 30.

2. Пераклады літаратурных твораў для эстрады і цырка аплачваюцца ў памеры ад 50 працэнтаў ставак, устаноўленых для арыгінальных твораў.

3. Сцэнарыі (пункты 65, 66) і тэксты для песень, што ствараюцца на аснове апублікаваных тэкстаў твораў, аплачваюцца ў памеры ад 50 працэнтаў ставак, устаноўленых для арыгінальных твораў.